свою эстетическую силу - образы дерева, птиц, образ солнца в виде круга и иных знаков. И именно благодаря перечисленным выше обстоятельствам мы можем наблюдать удивительные вещи: у таких далеких народов, как белорусский и японский, практически одинаково выражены основные национальные символы в народном искусстве - образ солнца и образ аиста. Как в японском, так и в белорусском народном искусстве главной идеей является преемственность. Идея берет свои истоки в национальном ощущении единства природных и народных начал, которые составляют духовную основу народного творчества, являются гармонией того, что способно через искусство обогатить человека духовно, нравственно. Необходимо сохранить связь между природой и творчеством, на которое вдохновила сама природа. Художественная и духовная традиция живого искусства - это и есть залог его развития.

В последнее время мы видим, как люди творческие - литераторы, художники, музыканты - обращаются к образам природы и народным традициям. Они хотят найти единство человека с природой, обрести в искусстве новое единство с традицией. Так народное искусство Беларуси само собой являет другую природу.

Человек, теряющий свою природность, утрачивает и свойственную ему духовную культуру. Не случайно образы природы в народном сознании всегда останутся выразителями красоты и добра. Они слиты с духовным миром, потому что природное выступает как критерий духовных ценностей человека.

**Л.М. Дзіцэвіч**

## БЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА І ДУХОЎНА - МАРАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ

Курс літаратуры сярод школьных прадметаў займае асобае месца, бо мастацкая літаратура – гэта дзейсны сродак выхавання, эстэтычнага уздзеяння на пачуцці і свядомасць вучняў. Беларуская літаратура як прадмет школьнага выкладання мае небагаты вопыт, бо ўпершыню на тэрыторыі Беларусі стала вывучацца толькі ў пачатку XX ст. У 1924 г. уведзеныя комплексныя праграмы адмянялі прадметнае навучанне, і літаратура з гэтага часу да 1931 г. стала выкладацца не як самастойная дысцыпліна, а як ілюстрацыя да грамадазнаўства. Доўгі час школьнае літаратуразнаўства было пад апекай вульгарна-сацыялагічнага дагматызму, сацыялістычнага рэалізму і іншых абмежаванняў. Многія гады крытыка па-свойму, а гэта азначае, як было загадана зверху, разумела духоўна-эстэтычныя пошукі аўтараў і іх герояў, ідэалагічны падыход змяншаў магутную выхаваўчую сілу мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння, калі настаў час пераасэнсавання мінулага, калі доступ да архіўных матэрыялаў выводзіць школьнае літаратуразнаўства на шлях аб'ектыўнага даследавання, узрастае роля мастацкай літаратуры як сродку духоўна-маральнага выхавання, бо нашае мінулае занатаванае пісьменнікамі ў падзеях і вобразах. Мэтазгодна найперш звярнуцца да жыцця і творчасці аўтараў, гісторыі напісання твораў, іх вобразаў, даследаваць тое, што на сёння па тых ці іншых прычынах заставалася схаваным пад знакам сакрэтнасці ці адпрэчвалася як шкоднае.

Асноўнай мэтай вывучэння біяграфіі пісьменніка з'яўляецца паказ сістэмы поглядаў творцы, яго маральна-духоўных, эстэтычных ідэалаў, асэнсавання ўнёску ў нацыянальную і агульначалавечую культуру.

Вялікую ролю іграе біяграфічны матэрыял і ў выхаванні вучняў. Асоба пісьменніка, паказаная ў прызме падзей, узаемаадносінаў, выказванняў, уплывае на фарміраванне маральных і эстэтычных уяўленняў школьнікаў. У 5 - 8-х класах біяграфія не з'яўляецца прадметам спецыяльнага вывучэння, і на гэтую тэму не адводзіцца спецыяльны ўрок. Аднак немэтазгодна вывучаць асобныя творы, не пазнаёміўшы вучняў з жыццёвымі акалічнасцямі аўтара. Часам вучні вывучаюць творчасць аднаго і таго ж пісьменніка некалькі разоў у розных класах, і неабходна падбіраць матэрыял з улікам узроставых асаблівасцей, ступені ўздзеяння на выхаванне школьнікаў.

Так, напрыклад, у V класе падчас вывучэння верша М.Багдановіча "Зімой", у VI класе пры вывучэнні верша "Па-над белым пухам вішняў" вялікую выхаваўчую ролю сыграюць біяграфічныя замалёўкі пра дзяцінства паэта, лёс маці, сям'ю Багдановічаў; вучні лепш зразумеюць паэтава незвычайнае бачанне свету, якое перадала маці, Марыя Мякота, што мела "чрезвычайную, иногда мучительную живость воображения"[1].

Вывучэнне творчай гісторыі верша "Слуцкія ткачыхі" наблізіць вучняў да падзей, што адбыліся летам 1911 г. ў Вільні, дзе гасцяваў М.Багдановіч у В.Ластоўскага. Дзеці даведаюцца пра збор Беларускага музея, сабраны рупнасцю Івана Луцкевіча, зведаюць пачуццё гонару за сусветную вядомасць народнага мастацтва, жалю па страчаным – "пасьля далучэння Беларусі да Расеі ў пачатку 19 стагодзьдзя было забаронена насіць кафтаны (кантушы) й таму неабходнасьць у слуцкіх паясох адпала, вытворчасьць іх спынілася... Польскія паясы можна разглядаць як далейшую распрацоўку слуцкага пояса ў сэнсе выкарыстоўвання арнаментацыі слуцкіх паясоў. Пад значным уплывам слуцкіх паясоў былі вырабы і ў Маскоўшчыне й на Ўкраіне"[2]. Менавіта наведванне Беларусі дапамагло юнаму Багдановічу адчуць слаўную гісторыю свайго краю і дало сілы на абарону яго. Ужо потым, студэнтам Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя, ў спрэчцы з выкладчыкам Максім абараняе свой народ, даказаўшы, што ёсць беларуская нацыя і беларуская мова.

Багдановічаў прыклад дапамагае сфарміраваць асноўныя маральныя якасці кожнага грамадзяніна – гонар за мінулае свайго народа, актыўную грамадскую пазіцыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

У 8-х і 10-х класах, дзе вывучаецца творчасць Багдановіча больш грунтоўна, можна спыніцца на больш шырокім матэрыяле яго жыцця. Вялікае выхаваўчае значэнне маюць “Материалы к биографии Максима Адамовича Богдановича”, напісаныя ў 1923 г. бацькам паэта, Адамам Ягоравічам, па просьбе Інстытута беларускай культуры. Рукапіс “Материалов...” быў страчаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але засталася копія, якую перадалі браты Максіма. Знаёмства з сістэмай выхавання, што ўплывала на светапогляд, эстэтычныя густы, духоўныя інтарэсы юнага паэта, несумненна акажа ўплыў на фарміраванне духоўна-маральных якасцей школьнікаў. Няведанне ж нават бацькам інтымных падрабязнасцей жыцця сына падштурхне да больш глыбокага вывучэння жыццёвых пуцявін вялікага паэта.

Вялікую выхаваўчую сілу мае матэрыял жыцця і творчасці Я. Купалы, які вывучаецца ў кожным класе, з 5-га па 11-ы. Глыбокай увагі заслугоўвае гэтая тэма і таму, што доўгі час у гады панавання савецкай сістэмы “ад чытачоў былі схаваныя многія старонкі біяграфіі паэта, і наадварот, у друку старанна падкрэслівалася, што яму былі створаныя ўсе умовы для плённай працы... Не ўсе творы Янкі Купалы, напісаныя ў 20-30-я гг., былі надрукаваныя. Толькі цяпер многія вершы, забароненыя ў часы таталітарызму, даходзяць да чытача. Забараняліся не толькі вершы, але і ўтойваліся самыя трагічныя старонкі біяграфіі паэта: выклікі на допыт, шальмаванне ў друку , абвінавачванні ў шкодніцтве ”[3].

Паэту з цяжкасцю ўдалося вярнуць з дарогі ў ссылку маці і сясцёр, абвінавачаных у кулацтве, жонцы Уладзіславе Францаўне ледзь удалося вярнуць Купалу з дарогі ў небыццё ў трагічную ноч 1930 г. Нам, сённяшнім, зрусіфікаваным, нельга па-сапраўднаму злучыцца душою з хараством роднага слова, калі не ўведаць, як “вялікі лінгвіст” П. Панамарэнка, першы сакратар ЦК КПБ, здзекаваўся з уласнабеларускіх слоў, абвінавачваў Купалу ў найцяжэйшым граху за тое, што той лічыў: “Пакуль жыве мова — жыве народ”, называў у 1938 г. Купалу і Коласа ў лісце да Сталіна “прафашысцкімі пісьменнікамі”. Па просьбе Панамарэнкі нашы песняры павінны былі трапіць у канвеер разгляду ў несудовым парадку па асобай тройцы жыхароў Беларусі па першай катэгорыі (расстрэл) і па другой (лагер або турма).

Маладое пакаленне выхоўваецца на прыкладах вялікай патрабавальнасці да сваёй працы, шчырага служэння народу, клопату пра нацыянальнае адраджэнне, вернасці грамадзянскай пазіцыі вялікага песняра, мужнасці ў абароне сапраўдных ідэалаў.

Вялікім выхаваўчым патэнцыялам напоўненыя радкі Купалы:

І засумуецца патомак,
Калі дазнаецца аб нас,
Што нейкі з нас хоць быў не зломак,
А плячы гнуў у крук не раз;
Не йшоў з адкрытымі вачыма
У свет і сцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасці магчымай

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Таптаў сляды, сябе таптаў [4].

Вялікім выхаваўчым зместам напоўненыя старонкі жыцця Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, С.Буднага, А.Міцкевіча і Я.Баршчэўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, Цёткі, Я.Коласа, А.Гарэцкага, А.Гаруна, М.Гарэцкага, Н.Арсенневай, Л.Геніюш, Я.Брыля, І.Мележа, А.Адамовіча, Н.Гілевіча, Г.Бураўкіна, Ул. Каратаевіча, Р.Барадуліна і іншых пісьменнікаў і дзеячаў культуры, творчасць якіх уключана ў праграму сярэдняй школы.

Пэўны ўплыў на фарміраванне духоўна-маральных якасцей вучняў аказвае аналіз мастацкіх твораў, работа над мастацкімі вобразамі. “Спасціжэнне рэчаіснасці праз літаратуру аказвае рашаючы ўплыў на фарміраванне ў вучняў школы вартасных (найперш маральных і эстэтычных) ацэнак, адносін да мінулага, сучаснага і будучыні. Мастацкія вобразы – гэта як бы незавершаныя абрысы рэчаіснасці, у якіх выяўляецца характэрная тэндэнцыя, сілуэт, што вабіць, як і сама рэальнасць, таямнічасцю яшчэ не вычарпанага ў ім, непазнанага, магчымасцю новых адкрыццяў”[5].

Глыбокай выхаваўчай сілай напоўнены творы Ул. Караткевіча, прыкладам самаадданага служэння Бацькаўшчыне з’яўляецца яго жыццё.

У VII класе вучні знаёмяцца з апавяданнем “Паром на бурнай рацэ” — пралогам да рамана “Нельга забыць”. Мэтазгодна на ўроку пазакласнага чытання разгледзець і сам раман: спалучэнне двух высокамастацкіх твораў акажа большае выхаваўчае ўздзеянне на чытача. Прааналізаваўшы апавяданне, вучні прыйдуць да высновы, што не заўсёды ўчынкі героя адлюстроўваюць яго характар, стан душы. Часам за знешнім цынізмам, абыякавасцю да любой маралі хаваецца трапяткое пачуццё спакутаванасці, віны перад людзьмі.

Так, вучні спачатку не разумеюць Пора-Леановіча ў яго непрыстойнасці, сарказме і іроніі, сімпатыі свае аддаюць Гораву — сумленнаму, чыстаму чалавеку. Але толькі потым з дапамогай настаўніка, падчас гутарак, усвядомяць складаную, супярэчлівую, трагічную натуру беларуса, прыхаваную талентам пісьменніка сітуацыю, калі “пякучы боль за зняважаную прыгнечаную родную зямлю нараджаў у яго пакалечанай душы гнеў і пагарду да сябе і да ўсяго свету”[6]. Вучні вучацца бачыць, што адбываецца з духоўна-надломленым і спустошаным чалавекам, як засмоктвае яго павуціна тупой падпарадкаванасці цынічнаму загаду. Аналіз апавядання падштурхне вучняў на самастойныя пошукі і наблізіць да высновы пра дзіўны менталітэт беларусаў, скалечаных за стагоддзі падпарадкавання не сваім інтарэсам, калі ў нашых зменених душах, як у таго Пора-Леановіча, выспявае пагарда да ўласнай культуры і мовы, ганьбаванне ўсяго беларускага. Настаўнік звяртае увагу вучняў на адну акалічнасць — сузіранне Горавым тысячы знічак-Леанідаў ў 1866 г., праз тры гады пасля падзей. Яны павінны прылятаць кожныя 33 гады. Ні ў 1899, ні ў 1932, 1965, 1998 гг. Леаніды не з’явіліся на нашай зямлі, відаць, шмат яшчэ на Зямлі войнаў, смерцяў, зла, болі і несправядлівасці. Наступны тэрмін — 2031 г., і важна, каб 13-гадовыя сямікласнікі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усвядомілі, што не трэба чакаць свайго 46-годдзя, а тварыць яго, бо "чалавек як знічка. Ён знікае, але і пасля смерці для нашчадкаў свеціць святлом сваіх спраў "[7]. І тады Леаніды вернуцца. Гэта, вядома, легенда, але рамантычная легенда, а каб не зачарсцвець душой, сцвярджаў Караткевіч, трэба верыць у легенды, не страчваць светлага і чыстага ўспрымання рэчаіснасці.

Героі твораў Караткевіча валодаюць вялікай прыцягальнай сілай, выклікаюць у чытачоў жаданне быць падобнымі да іх, будзяць жывую думку. "Іх духоўнае багацце і прыгажосць, маральная чысціня і беззаганнасць, вернасць перадавым грамадскім і эстэтычным ідэалам прываблiваюць і хвалююць нашага сучасніка, асабліва моладзь, у якой пісьменнік карыстаецца вялікай папулярнасцю"[8].

Духоўныя, маральна-філасофскія шуканні беларускіх пісьменнікаў стварылі светлавы калідор, у які вучні трапляюць пад уздзеяннем вялікай выхаваўчай магутнасці мастацкай літаратуры. "Справядлівасць, маральнасць, актыўнае адстойванне дабра, непрыманне зла. Народ, радзіма, -- вернасць ім да апошняга. Прыгажосць, каханне, любоў," — гэтымі словамі крытыка Я. Гарадніцкага нельга абмежаваць сістэму маральных каштоўнасцей у беларускай мастацкай літаратуры. Легендарнае і рэальнае, узнёслае і побытавае, шырокае і звужанае, грамадскае і індывідуальнае -- сумесь аспектаў мастацкай літаратуры яшчэ ярчэй высвечвае праблемы маральных пошукаў аўтараў і іх герояў, неабходныя для назапашвання маральнага вопыту чалавецтва. І на гэтым шляху разам з імі маленькія чытачы-школьнікі, якім ладаваць будучыню нашай краіны, ад маральнага выбару якіх залежыць лёс Беларусі.

[1] Багдановіч А.Я. Материалы к биографии Максима Адамовича Богдановича // Беларуская літаратура: Даследаванні і публікацыі. - Мн., 1960. -- С. 176.
[2] Ул. Глыбінны. Пад лебядзіным знакам: Аповесць пра Максіма Багдановіча. - Нью-Ёрк, 1983. -- С. 13.
[3] Шкраба Р.В. Янка Купала // Беларуская літаратура: Падручнік для 9 кл. сярэдняй школы. - Мн., 1997. -- С. 12.
[4] Я. Купала. Жыве Беларусь. - Мн., 1993. - С. 413.
[5] Рагуля А. Методыка выкладання беларускай літаратуры. - Мн., 1986. - С. 8.
[6] Верабей А.Л. Жывая повязь часоў. - Мн., 1985. - С. 39.
[7] Тамсама, с. 40.
[8] Верабей А. Л. Жывая повязь часоў. - Мн., 1985. - С. 99.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Г.М. Зенава**

## РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ПРОЗЫ Ў СТАНАЎЛЕННІ АСОБЫ (на прыкладзе апавяданняў 1980 — 1990-х гг.)

Беларуская мастацкая літаратура — гэта не проста крыніца адлюстравання жыцця, але і дзейсны сродак выхавання, эстэтычнага ўздзеяння на пачуцці і свядомасць падрастаючага пакалення. Адна з